бытным жыцьцём, і не было тады чалавека, каторы б мог падумаць, што некалі беларуская мова будзе лічыцца нават самімі беларусамі „простай“, „мужыцкай“...

Хто вінавайца гэткага страшэннага ўпадку беларускага народу?

Упадак гэты пачаўся з таго часу, як, пасьля Люблінскай уніі, наш Край пачаў жыць супольным з Польшчай жыцьцём, як да нас пачалі наплываць каляністы з Польшчы[2]. Не безь віны і нашы прашчуры — наша шляхта і панства вяльможнае, каторыя дзеля розных прывілеяў ад польскіх каралёў, дзеля сваей карысьці ядналіся з чужынцамі і прынімалі іх мову, іх звычаі, іх нацыянальнасьць. Але яд здрады сваей нацыі і свайго народу ўлілі ў іх душы гэтыя прышлыя да нас людзі. І ажно да нашых дзён гэтыя людзі з падмогай нашых беларускіх адшчапенцаў і рэнэгатаў вядуць далей сваю нішчучую работу між беларусамі, высысаючы з народу нашага ўсе яго сокі, забіраючы на службу да сябе ўсе інтэлігентныя сілы, якіх не здалелі ўлавіць маскалі.

Ня дзіва, што ў нас „нічога няма“: бо, калі збудзіліся ўрэшце да нацыянальнага жыцьця нашы беларусы, калі пачалі творчую культурную работу, каб стварыць сабе тое, чаго няма, дык гэтыя каляністы з чужой нам Польшчы і папаўшыя ў іх сеці сыны нашага народу выступілі *проці* беларусаў, змагаліся зь беларускім рухам да нацыянальнага адраджэньня пад расейскім панаваньнем і аб’явілі яму сьмяротную вайну з таго моманту, як уласьць Расеі ў нас счэзла. Яны пануюць у каталіцкім касьцёле і праз касьцёл, замяніўшы Крыж на Белага Арла, служаць адно польскай справе, прамаўляючы да беларусаў у чужой для іх польскай мове, закладаючы для іх польскія школы...

Так, у нас „нічога няма“, бо нашае духавенства, каторае, едучы да дзікіх плямён, вучыцца мовы тых дзікароў і ў ёй зь імі гаворыць, тут, на нашай зямлі, нашай мовы беларускай знаць *ня хоча*. Духавенства *павінна* нам даць кніжку да навукі рэлігіі па–беларуску, *павінна* вучыць нас рэлігіі ў роднай мове. Але яно гэтага ня робіць, яно сваe павіннасьці перад беларусамі не спаўняе, ды яно ж апраўдываецца тым, што ў нас „нічога няма!“...

Даволі пераглядзець сьпісы нашых ксяндзоў, і мы ўбачым, што між імі аграмадны працэнт беларусаў. Яны беларускую мову знаюць: у ёй жа першыя словы казаць вучыліся, яе чулі ад малых дзён, чуюць у сваіх парафіях навакол сябе і цяпер. Але, калі ў іншых зь іх збудзілася беларускае сумленьне, калі яны выяўляюць ахвоту да працы для свайго народу, — ім гэта забараняе іх духоўная ўласьць. І тая ж уласьць пасьля кажа, што ў беларусаў „нічога няма“, што з тэй толькі прычыны духавенства ня можа нічога для беларусаў зрабіць... Няхай так: няхай „нічога няма“ ў нашага народу, але затое народ наш, пeратрываўшы сотні гадоў няволі, жыве і астаецца беларускім. А пакуль ёсьць у ім іскра жыцьця, датуль можам верыць, што ён здабудзе ізноў для сябе ўсё тое, што ліхая доля рукамі чужынцаў ад яго забрала.

## Цікавае выступленьне

Той факт, што прадстаўнікі вышэйшай духоўнай уласьці ў Віленскай дыяцэзіі, на жаль, ужо даўно пазбаўленай свайго галавы — біскупа[1], усе прыналежаць да абозу польскіх нацыяналістаў, тлумачыць зусім ясна, чаму тут не даюць ходу ані беларускай мове ў касьцеле, ані ксяндзом–беларусам. Бо, калі прыраўнуем палажэньне ў Віленшчыне, дзе беларусы пераважываюць, да палажэньня ў Ковеншчыне, дзе беларусаў — малая жменя, але затое біскуп — літвін, дык убачым, якая вялікая розьніца ў адношаньні духавенства да беларусаў тут і там. У тым часе, як у Віленшчыне вышэйшыя духоўныя ўласьці заяўляюць, што тут „няма ксяндзоў, якія ўмелі б па–беларуску“, а гэтыя апошнія баяцца пярэчыць гэтаму, у Ковенскай дыяцэзіі ксяндзы–беларусы ня толькі не баяцца прызнавацца да беларушчыны, але нават выступаюць як беларусы зусім адкрыта і афіцыяльна.

Цікавы прыклад гэтага становіць прамова ксяндза М. Далецкага, пробашча ў Скапішках, сказаная па–беларуску на інгрэсе[2] біскупа Карэвіча ў 1914 гаду. Яна памешчана ў літоўскай кніжцы „Jo malonybė naujas Žemaičių vyskupas *Pranciškus Karevičius*“[3] (Kaunas, 1914). Перадрукоўваем гэту прамову даслоўна:

„У склад нашай дыяцэзіі ўходзіць, апрыч жмудзінаў і літоўцаў[4], значнае чысло і другіх народнасьцяў: палякаў, беларусаў, латышоў і немцаў. Гэткая народная рабізна ў дыяцэзіі ёсьць абразом паўшэхнага[5] каталіцкага касьцёла, каторы абнімаець усе народнасьці на ўсей зямлі.

Беларусаў у Жмудзкай дыяцэзіі ёсьць на 60 тысячаў, а можа і болей; каб гэта было за граніцай — у Францыі ці Італіі, дык напэўне была б цэлая дыяцэзія. Беларусы — народ многа цямнейшы за сваіх суседзяў палякаў, а нават і літоўцаў, і культуральна яны стаяць ніжэй; аднак яны маюць і добрыя староны: дужа крэпка прывязаны да касьцёла, да веры, да духавенства, біскупаў і Сталіцы Апастольскай.

Яны маюць душу і сэрца і адчуваюць долю і нядолю, смутак і радасьць. Сягоньня і яны цешуцца, дачакаўшы сабе новага біскупа, і спадзяваюцца, што ён для ўсіх сваіх авечак, нягледзя на народнасьць, будзець праўдзівым айцом і духоўным кіраўніком.

Ад іменя маіх спаўбратоў беларусаў я ўзнашу тост за здароўе Найдастойнейшага нашага Біскупа і жычу, каб Бог Яго Эксцэленцыю захаваў на доўгія гады для дабра касьцёла і пажытку авечак, паверaных яго аўчарні. Няхай жывець наш Пастыр!“

Трэба спадзявацца, што і ў Віленскай дыяцэзіі счэзьне ўціск беларускай мовы ў касьцеле, калі і гэта дыяцэзія дажджэцца свайго біскупа, калі і сюды будзе назначан чалавек, каторы на першым пляне паставіць справы веры, а ня справы польскай нацыянальнай палітыкі.

## Яго Эксцэленцыі Імпэрскаму Канцлеру

Арганізаванае беларускае грамадзянства (Weissruthenentum) лічыць сваім безумоўным абавязкам ад імя дзевяцімільённага народу выказаць Вашай Эксцэленцыі перакананьне, што Беласток (па–польску Białystok), другі па велічыні беларускі горад і найбольшы прамысловы цэнтар вобласьці[1], які зь яго беларускамоўным навакольлем ніколі не належаў уласна Польшчы[2], ніколі не перайдзе ў склад Польскай дзяржавы, бо гэта было б (страшэннай) несправядлівасьцю ў дачыненьні да беларускага народу і ў супярэчнасьці з прынцыпам абароны прыгнечаных народаў Расеі, які Ваша Эксцэленцыя абвясьціла ў Райхстагу.

Беларускае насельніцтва ніколі не было б задаволена польскім панаваньнем, і гэта было б прычынаю ўзьнікненьня працяглых складанасьцяў.

Старшыня Беларускага камітэту[3] *Антон Луцкевіч*
Рэдактар беларускай газэты „Гоман“ *Вацлаў Ластоўскі*
Дырэктар гарадзкой прафэсійнай пажарнай каманды *Дамінік Сямашка*
Прадстаўнікі Беларускай работніцкай групы *Язэп Салавей, Язэп Ліцкевіч, Язэп Туркевіч*
Старшыня Беларускага клюбу *Іван Луцкевіч*

## Воля Краю

За наш Край гэтулькі ўжо людзей бралася гаварыць, дык гэтак розна гаварылі ўсе ад яго ж імі, што, слухаючы здалёк, папраўдзе не распазнаеш, каторы голас належыць да адвечных жыхароў і гаспадароў яго, каторы — да прыблуд і ўсялякіх самазванцаў. І тым